# Тыповыя памылкі пры канструяванні словазлучэнняў у беларускай мове (маўленні) вучняў пачатковых класаў

*Камянчук Валерыя Вадзімаўна*

УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Ва ўмовах білінгвізму шэраг памылак у беларускай мове вучняў узнікае пад уздзеяннем сучаснай рускай мовы. Асноўнымі моўнымі памылкамі малодшых школьнікаў з'яўляюцца наступныя: няўдачны выбар слоў, няправільнае вымаўленне, скажоныя марфалагічныя формы, няправільна пабудаваныя словазлучэнні (памылкі словаўжывання, арфаэпічныя, марфалагічныя, сінтаксічныя памылкі).

Прычыны памылак, якія прыводзяць да парушэння сінтаксічнай сувязі слоў, розныя. Гэта і ўплыў роднай гаворкі (народна-дыялектнай мовы) і механічны перанос нормы рускай мовы, і няведанне граматычнай катэгорыі роду, і няправільнае ўжыванне прыназоўніка, і падмена склонавай формы пад уплывам сінтаксічнай блізкасці слоў, якія могуць быць у ролі галоўнага кампанента словазлучэння.

Засваенне вучнямі пачатковых класаў сінтаксічных нормаў беларускай літаратурнай мовы залежыць не толькі ад унутрымоўных фактараў (засваенне адзінак мовы), але і ад функцыяніравання беларускай мовы). Да тыповых граматычных памылак у канструяванні словазлучэнняў, якія былі выяўлены ў працэсе назірання за мовай вучняў, можна аднесці:

1) парушэнне заканамернасцей кіравання (смяяцца над ім);
2) парушэнне законаў дапасавання ("два стала" замест "два сталы");
3) спалучэнне аднародных членаў (хваляваццa і ўбачыла яго).

Існуюць розныя прычыны, якія вядуць да парушэння сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэннях:

1) недастатковае засваенне граматычных катэгорый роду і ліку;
2) няправільнае ўжыванне прыназоўніка;
3) уплыў народна-дыялектнай мовы;
4) з'явы інтэрферэнцыі, г. зн. ужыванне сінтаксічных канструкцый рускай мовы.

Вывучэнне курса беларускай мовы ў пачатковых класах адбываецца ва ўмовах двухмоўя (білінгвізму) – папераменнага выкарыстання беларускай і рускай моў. Двухмоўе можа разглядацца ў трох аспектах: псіхалагічным, педагагічным, сацыялінгвістычным. Сучасная моўная сітуацыя, якая склалася ў пачатковай школе, можа быць вызначана як

руска-беларускае (яно характэрна для вучняў гарадской мясцовасці) і беларуска-рускае двухмоўе (уласціва для вучняў сельскай мясцовасці).

Інтэрферэнцыя закранае ўсе падсістэмы беларускай мовы: фанетыку, арфаэпію, марфалогію, сінтаксіс і інш.

Вядома, што для паспяховага пераадолення тых ці іншых памылак вучняў неабходна высветліць прыроду гэтых памылак, у чым вялікую дапамогу аказваюць адпаведныя класіфікацыі. У цяперашні час найбольшай паўнатой характарызуюцца класіфікацыі арфаграфічных і пунктуацыйных памылак, а таксама лексічных, марфалагічных, стылістычных. Адносна сінтаксічных памылак зроблены толькі першыя крокі іх абагульнення і класіфікацыі [2, 47]. Прывядзём адну з такіх класіфікацый:

І. Сінтаксічныя памылкі, звязаныя з парушэннем сінтаксічных уласцівасцей слоў.

1) канкрэтных лексем – лексічна-сінтаксічныя памылкі.

1.1 Гэта найбольш частыя памылкі дадзенага тыпу – выкарыстанне кіруемага назоўніка не ў тым склоне, якога патрабуе кіруючае слова (табл. 1, табл. 1.1, табл. 1.2). Напрыклад:

Табліца 1. Выкарыстанне кіруемага назоўніка ў склоне

| Вучні ўжываюць | Трэба ўжываць |
|---|---|
| “прасіць савет”<br>“дзякаваць бацька”<br>“здзіўленне шчодрасцю”<br>“даравац ворага” | “прасіць савета”<br>“дзякаваць бацьку”<br>“здзіўленне шчодрасці”<br>“даравац ворагу” |

Табліца 1.1. Замена прыназоўнікаў

| Вучні ўжываюць | Трэба ўжываць |
|---|---|
| “назірала на яго”<br>“стаялі на праходзе”<br>“беражліва адносіўся з кнігамі” | “назірала за ім”<br>“стаялі ў праходзе”<br>“беражліва адносіўся да кніг” |

Табліца 1.2. Выкарыстанне беспрыназоўнікавага кіравання замест прыназоўнікавага і наадварот

| Вучні ўжываюць | Трэба ўжываць |
|---|---|
| “ехалі веласіпедам”<br>“хварэць ангінай”<br>“старэй брата” | “ехалі на веласіпедзе”<br>“хварэць на ангіну”<br>“старэйшы за брата” |

Прычына падобных памылак заключаецца ў з'яве "семантычнай аналогіі", пры якой семантычная агульнасць слоў, а іменна іх прыналежнасць да адной лексіка-семантычнай групы, нараджае іх фармальнае падабенства - аднолькавыя сінтаксічныя спалучальныя ўласцівасці. Для прадухілення лексіка-сінтаксічных памылак неабходна яшчэ ў працэсе вывучэння раздзела "Лексіка" звяртаць увагу вучняў на ўласцівасці лексемы і затым выкарыстоўваць гэтыя веды ў курсе сінтаксісу [1, 24].

2 Марфолага-сінтаксічныя памылкі (табліца 2, табліца 2.1, табліца 2.2), напрыклад:

Табліца 2. Ужыванне ў словазлучэннях назоўнікаў не ў той форме ліку

| Вучні ўжываюць | Трэба ўжываць |
|---|---|
| “сінія чарнілы”<br>“адкрыў дзвер”<br>“смачная маліна” | “сіняе чарніла”<br>“адкрыў дзверы”<br>“смачнай маліны” |

Табліца 2.1. Ужыванне ў словазлучэннях назоўнікаў не ў той форме роду

| Вучні ўжываюць | Трэба ўжываць |
|---|---|
| “белы гусь”<br>“смачнае яблака”<br>“шэрая шынель”<br>“вялікая сабака” | “белая гусь”<br>“смачныя яблык”<br>“шэры шынель”<br>“вялікі сабака” |

Табліца 2.2. Ужыванне ў словазлучэннях назоўнікаў не ў той форме склону

| Вучні ўжываюць | Трэба ўжываць |
|---|---|
| “бачу грыба”<br>“хадзіць па палям” | “бачу грыб”<br>“хадзіць па палях” |

Марфолага-сінтаксічныя памылкі можна прадухіліць, калі звяртаць увагу вучняў на сінтаксічныя ўласцівасці лексіка-граматычных класаў слоў.

Сінтаксічныя памылкі, не звязаныя з парушэннем сінтаксічных уласцівасцей, класіфікуюцца як уласна-сінтаксічныя памылкі.

Да найбольш частых памылак дадзенага тыпу можна аднесці наступныя адхіленні ад літаратурных норм:

а) парушэнне дапасавання ў родзе і ліку.

б) памылкі, звязаныя з ужываннем няправільнай формы дзеяслова-выказніка пры аднародных дзейніках, напрыклад: “На парце ляжаў аловак і сшытак”.

в) парушэнне дапасавання ў родзе ў сказах з прыдаткам, напрыклад: “Алена Васільеўна, дырэктар школы, павіншаваў нас з пачаткам навучальнага года”.

г) парушэнне будовы складаных сказаў, напрыклад: “На ўроках мы навучыліся многаму, якое нам спатрэбіцца ў жыцці”.

д) парушэнне будовы сказа з дзееприслоўнымі зваротамі, напрыклад: “Ідучу ў школу, у мяне згубіліся ключы”.

Адным з найбольш эффеектыўных спосабаў прадухілення памылак з’яўляецца стварэнне на ўроках праблемных сітуацый і рашэнне пошуковых задач. Напрыклад, дзецям прпануецца пытанне: “Чым можа быць выклікана памылка вучня ў словазлучэнні “залатая мядаль”?” Пры адказе на гэтае пытанне вучні павінны вызначыць прычыну і выправіць памылку. Такія заданні складаныя і патрабуюць некаторага навыку, таму ў пачатку можна даваць больш простыя заданні, напрыклад: “знайдзіце памылку ў словазлучэнні ...”. У такім выпадку вучню неабходна знайсці памылку, а адпаведнае правіла сфармулюе настаўнік.

Прыведзеная вышэй класіфікацыя сінтаксічных памылак дапаможа настаўніку вызначыць тыповыя памылкі вучняў. У гэтым выпадку настаўнік можа даваць індывідульныя заданні, якія будуць накіраваны на прадухіленне адпаведнага класа памылак.

Як паказвае аналіз пісьмовых работ і вусных выказванняў малодшых школьнікаў, найбольш часта дзеці дапускаюць парушэнне норму злучэння слоў у словазлучэннях:

а) з аднакарэннымі дзеясловамі (норма: пісаць, апісваць (што?); прыслухоўвацца (да чаго?), услухоўвацца (у што?));

б) з аднакарэннымі назоўнікамі і дзеясловамі (норма: апісваць (што?), апісванне (чаго?));

в) з дзеясловамі – зваротным і незваротным (норма: турбаваць (каго?), турбавацца (аб чым?)).

Вывучэнне беларускай і рускай моў, іх падсістэм, асабліва марфалогіі і сінтаксісу, у пачатковых класах павінна ісці шляхам параўнання іх граматычных сістэм. Аднак на ўроках беларускай і рускай моў супастаўляльнаму аналізу моўных з’яў амаль не ўдзяляецца ўвагі, што прыводзіць да інтэрферэнтных памылак. Выпраўленне памылак у структуры словазлучэнняў, як і папярэджанне іх, павінна ісці на працягу ўсяго навучання.

Такім чынам, вывучэнне словазлучэнняў у школе, праца з мэтай знаходжання памылкі ў будове словазлучэннняў, паказ нормаў

дапасавання і кіравання – усё гэта павінна ўзбагаціць мову (маўленне) вучняў новымі сінтаксічнымі канструкцыямі, папярэдзіць з’яўленне розных недахопаў у мове.

Спіс літаратуры

1. Грушевская, М.И. Ошибки школьников при конструировании словосочетаний и предложений / М.И. Грушевская // Русский язык в школе. – 1989. - № 1. – С. 3–7

2. Гусева, А.А. Работа над закреплением понятия “признаки текста” / А.А. Гусева // Начальная школа. – 1995. - № 6. – С. 13–17